

# РАДА ЕЎРОПЫ
# КАНВЕНЦЫЯ АБ СУПРАЦЬДЗЕЯННІ ГАНДЛЮ ЛЮДЗЬМІ

Першы міжнародны прававы інструмент, які ставіць абарону правоў ахвяр у цэнтр барацьбы супраць гандлю людзьмі. Адкрытая для падпісання дзяржавамі, якія не з'яўляюцца ўдзельніцамі Рады Еўропы.

**2005** Прынянцце ў Варшаве

**2008** Ступленне ў сілу

**2025** 48 дзяржаў-удзельніц

## У ЧЫМ ПАЛЯГАЕ ВАЖНАСЦЬ КАНВЕНЦЫІ?

- Канвенцыя ўважае гандаль людзьмі парушэннем правоў чалавека
- Яна тычыцца ўсіх ахвяр і ўсіх форм гандлю людзьмі
- Яна скіраваная на абарону правоў ахвяр
- Яна забяспечвае сістэму для абароны ахвяр і сведкаў
- Яна ўсталёўвае механізм маніторынгу для забеспячэння эфектыўнай рэалізацыі

## ЯУІЯ АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ КАНВЕНЦЫІ?

→ ПРАДУХІЛЕННЕ
→ АБАРОНА
→ ПРЫЦЯГНЕННЕ ДА АДКАЗНАСЦІ
→ ПАРТНЁРСТВА

## ЯКІЯ ПРАВЫ МАЮЦЬ АХВЯРЫ ГАНДЛЮ ЛЮДЗЬМІ ПАВОДЛЕ КАНВЕНЦЫІ?

### ПРЫЗНАННЕ
Права быць прызнанымі ахвярамі незалежна ад наяўнасці крымінальнага пераследу тых, хто здзяйсняе гандаль людзьмі.

### АБАРОНА ПРЫВАТНАГА ЖЫЦЦЯ
Асабістыя даныя ахвяр не могуць быць абнародаваныя і могуць захоўвацца толькі ў пэўных законных мэтах.

### ПАДТРЫМКА
Незалежна ад таго, ці супрацоўнічаюць ахвяры са следствам, яны маюць права на належнае і бяспечнае жытло, псіхалагічную, матэрыяльную і іншую дапамогу.

### ПЕРЫЯД АДАПТАЦЫІ І АСЭНСАВАННЯ
Меркаваныя ахвяры маюць права на перыяд адаптацыі і асэнсавання працягласцю не менш за 30 дзён, каб выйсці з-пад уплыву гандляроў людзьмі і/або прыняць рашэнне адносна супрацоўніцтва з уладамі.

### ВІД НА ЖЫХАРСТВА
Права на аднаўляльны від на жыхарства, калі гэтага вымагае асабістая сітуацыя ахвяр або калі ім неабходна застацца ў краіне для супрацоўніцтва са следствам або для ўдзелу ў крымінальным працэсе.

### КАМПЕНСАЦЫЯ І ЮРЫДЫЧНАЯ ПАДТРЫМКА
Права на інфармацыю, юрыдычную падтрымку, бясплатную юрыдычную дапамогу і кампенсацыю за матэрыяльную і нематэрыяльную шкоду.

### РЭПАТРЫЯЦЫЯ І ВЯРТАННЕ
Вяртанне ахвяр у краіну іх паходжання павінна адбывацца з належнай павагай да іх правоў, бяспекі і годнасці, а таксама з улікам любых звязаных з імі судовых працэсаў.

### МАГЧЫМАСЦЬ НЕ НАКЛАДАЦЬ ПАКАРАННЕ
Дзяржавы павінны прадугледзець магчымасць не накладаць пакаранне на ахвяр гандлю людзьмі за ўдзел у незаконнай дзейнасці, да якой яны былі вымушаныя.

### АБАРОНА ПАДЧАС РАССЛЕДАВАННЯ І СУДОВАГА ПРАЦЭСУ
Ахвяры і іхныя сем'і маюць права на абарону ад патэнцыйнай помсты і запалохвання.

### ПРАВЫ ДЗЯЦЕЙ
У дадатак да правоў, якія тычацца ўсіх ахвяр гандлю людзьмі, дзеці атрымліваюць спецыяльную дапамогу і меры абароны, якія ўлічваюць іх найлепшыя інтарэсы.

# МЕХАНІЗМ МАНІТОРЫНГУ

Важным складнікам Канвенцыі з’яўляецца механізм маніторынгу, створаны для кантролю за яе выкананнем. Ён складаецца з двух органаў і праводзіцца ў пастаянным дыялогу з краінамі-удзельніцамі.

### ЭКСПЕРТНАЯ ГРУПА ПА БАРАЦЬБЕ З ГАНДЛЕМ ЛЮДЗЬМІ (GRETA)

15 незалежных экспертаў
Міждысцыплінарная экспертыза

GRETA перыядычна ацэньвае выкананне Канвенцыі ў кожнай дзяржаве-ўдзельніцы. Гэта ўключае накіраванне апытальнікаў уладам і арганізацыям грамадзянскай супольнасці, наведванне краіны і падрыхтоўку справаздачы з высновамі і заключэннямі. GRETA таксама дае рэкамендацыі па тэмах і канцэпцыях Канвенцыі.

### КАМІТЭТ БАКОЎ

Палітычны орган, які складаецца з прадстаўнікоў дзяржаў, якія ратыфікавалі Канвенцыю

На падставе дакладаў і заключэнняў GRETA, Камітэт бакоў накіроўвае дзяржавам-удзельніцам рэкамендацыі адносна мер, якія павінны быць прынятыя для ажыццяўлення заключэнняў GRETA.

## ДЗЯРЖАВА-УДЗЕЛЬНІЦА ПРАХОДЗІЦЬ МАНІТОРЫНГ КОЖНЫЯ 4-5 ГАДОЎ

**1ШЫ ЭТАП**
2010
Фокус: Агляд выканання Канвенцыі

**2ГІ ЭТАП**
2014
Фокус: Вынік праведзеных мер, гандаль дзецьмі і новыя тэндэнцыі

**3ЦІ ЭТАП**
2018
Фокус: Доступ да правасуддзя і эфектыўных сродкаў прававой абароны

**4ТЫ ЭТАП**
2023
Фокус: Групы, якім пагражае гандаль людзьмі, і выкарыстанне інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій

## ЯК ПРАВОДЗІЦЦА МАНІТОРЫНГ?

На кожным этапе GRETA складае **апытальнік**, які накіроўваецца нацыянальным уладам і грамадзянскай супольнасці.

→ GRETA **наведвае краіну** для збору дадатковай інфармацыі. GRETA прымае **праект справаздачы**, які накіроўваецца ўладам для каментарыяў.

→ Пасля атрымання каментарыяў ад улад, GRETA прымае і публікуе **канчатковую справаздачу.**

→ Камітэт бакоў прымае **рэкамендацыі,** заснаваныя на заключэннях GRETA. Урады робяць справаздачу Камітэту бакоў адносна **мер па выкананні** гэтых рэкамендацый.

→ У адказ GRETA рыхтуе **дадатковыя пытанні** і/ або арганізуе **круглы стол** у адпаведнай краіне.

## ТЭМАТЫЧНАЯ ПРАЦА GRETA

GRETA выпусціла тэматычныя даклады і рэкамендацыі на тэмы:

- Гандаль людзьмі з мэтай працоўнай эксплуатацыі
- Гандаль дзецьмі
- Дапамога пацярпелым
- Доступ да міжнароднай абароны для ахвяр гандлю людзьмі
- Інтэрнэт і тэхналогіі, якія спрыяюць гандлю людзьмі
- Гандаль людзьмі ў кантэксце міграцыі
- Перыяд адаптацыі і асэнсавання

## ВЫНІКІ МАНІТОРЫНГУ

- Змены ў заканадаўстве
- Прызначэнне нацыянальных дакладчыкаў па пытаннях гандлю людзьмі
- Прынясце стратэгій і планаў дзеянняў па барацьбе з гандлем людзьмі
- Палепшаныя працэдуры ідэнтыфікацыі ахвяр гандлю людзьмі
- Стварэнне адмысловых прытулкаў
- Павелічэнне фінансавання на дапамогу пацярпелым
- Навучанне і спецыяльная падрыхтоўка персаналу

**ДАДАТКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Усе справаздачы па краінах, рэкамендацыі і публікацыі даступныя онлайн.

www.coe.int/trafficking
trafficking@coe.int

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L’EUROPE